УДК 908:63 “1921/1929”

# СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ ВЫСТАВЫ Ў 1920-Я ГГ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВІЦЕБШЧЫНЫ)

Карпекін К.Р., галоўны захавальнік фондаў
установа “Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці”
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

Ключавыя словы: Віцебшчына, сельскагаспадарчая выстава, экспанат.

Рэферат. У артыкуле прааналізаваны асаблівасці правядзення сельскагаспадарчых выстаў – адной з форм абмену вопытам і стымулявання развіцця сельскай гаспадаркі, якая прымянялася ў 1920-я гг.

Пошукі новых форм развіцця сельскай гаспадаркі ў гады НЭПу паспрыялі разгортванню ў савецкіх рэспубліках шэрагу мерапрыемстваў, якія якасна адрозніваліся ад захадаў перыяду “ваеннага камунізму”. У БССР праводзіліся хутарызацыя, пераразмеркаванне зямельнага фонду паміж гаспадаркамі, механізацыя агранамічных і жывёлагадоўчых працэсаў, былі створаны ўмовы для развіцця кааперацыі. У рэчышчы праводзімых мерапрыемстваў у 1920-я гг. распрацоўваліся і новыя формы агітацыі і стымулявання сялян, адной з якіх сталі сельскагаспадарчыя выставы. У дадзеным даследаванні асаблівасці іх правядзення разгледжаны на прыкладзе Віцебскага рэгіёна.

Першапачаткова пасля абвяшчэння НЭПу сельскагаспадарчыя выставы былі адзінкавымі з’явамі і не ахоплівалі вялікай колькасці сялянскіх гаспадарак. Напрыклад, 25–30 верасня 1921 г. у Аршанскім павеце была праведзена 1-я Аршанская сельскагаспадарчая выстава, яна мела вузкаспецыялізаваную скіраванасць і была прысвечана дасягненням жывёлагадоўлі. З улікам таго, што мерапрыемства мела павятовы ўзровень, яго нельга назваць маштабным: у якасці экспанатаў былі прадстаўлены 8 коней, 4 быкі, 3 каровы, 1 авечка і 4 свінні [2, арк. 3].

18 лютага 1922 г. бюро аргапрапаганды Народнага камісарыята земляробства РСФСР прапанавала ўсім губернскім зямельным упраўленням правесці восенню сельскагаспадарчыя выставы. У кастрычніку 1922 г. планавалася Віцебская губернская сельскагаспадарчая выстава, а павятовыя выставы прапаноўвалася праводзіць не пазней за верасень. Тым не менш, амаль ва ўсіх паветах выставы праведзены не былі, бо на гэта не мелася матэрыяльных сродкаў. У Дрысенскім павеце правялі неабходную падрыхтоўку і выстава планавалася на кастрычнік, але праз абыякавае стаўленне насельніцтва і адсутнасць экспанатаў ад сялян мерапыемства не адбылося. Такім чынам, першы вопыт правядзення сельскагаспадарчых выстаў у Віцебскай губерні аказаўся цалкам няўдалым [1, арк. 1–2, 4–6, 8–9, 12, 15, 29, 32, 35, 37, 39–41].

У верасні 1922 г. Народны камісарыят земляробства РСФСР прапанаваў праводзіць губернскія, павятовыя і дробнараённыя выставы коней – дзеля “збліжэння конеўладальнікаў і выклікаючы ў іх спаборніцтва і абмен карыснымі звесткамі”. У некаторых паветах Віцебскай губерні дадзеная прапанова была ўспрынята станоўча: у прыватнасці, 2 выставы па жывёлагадоўлі адбыліся ў Гарадоцкай і Лёзненскай валасцях Віцебскага павета ў ліпені 1923 г., у Аршанскім павеце выстава коней прайшла ў другой палове верасня 1923 г. У шэрагу паветаў (Веліжскім, Полацкім і інш.) такія выставы не праводзіліся. Галоўнымі прычынамі гэтага з’яўляліся недахоп сродкаў, кароткі перыяд, адведзены на падрыхтоўку, а таксама неабходнасць удзелу ва Усерасійскай сельскагаспадарчай выставе [2, арк. 11, 16–19]. Апошняя мусіла адбыцца ў жніўні 1923 г. у Маскве.

З мэтай падрыхтоўкі да Усерасійскай сельскагаспадарчай выставы 11 студзеня 1923 г. быў створаны Віцебскі губернскі выставачны сельскагаспадарчы і саматужна-прамысловы камітэт. Змест экспанатаў абмяркоўваўся вельмі актыўна і неаднаразова змяняўся. У выніку да канца чэрвеня было вырашана, што аснову экспазіцыйнага матэрыялу ад рэгіёна павінны складаць геаграфічная карта Віцебскай губерні, дыяграмы па розных сферах развіцця сельскай гаспадаркі, фотаздымкі сядзіб, узоры насення (у спецыяльных скрынях, па 2 фунты кожнага гатунку), снапы збожжавых культур, гербарыі травяністых раслін, узоры глебы і дзёрну (у драўляных скрынях, накрытых шклом), карняплоды і гародніна, узоры гатунках яблыкаў і груш, макет двара плямгаса "Дзядзілава" Аршанскага павета (у маштабе 1:30), узоры сыроў галандскага і тыльзіцкага гатункаў, узоры масла, прадукты перапрацоўкі поўсці, фотаздымкі раслін, жывёл і інш. [3, арк. 1, 12 адв., 18 адв., 60].

Падрыхтоўку да Усерасійскай выставы ажыццяўлялі і некаторыя павятовыя зямельныя аддзелы. Ад Себежскага павета было вырашана камандыраваць двух аграномаў, адправіць палепшаныя гатункі сельскагаспадарчых культур і апрацаваныя скуры. У Лепельскім павеце зямельнае упраўленне пачало выяўленне экспанатаў шляхам перапіскі, якая амаль цалкам была праігнаравана валвыканкамамі. У сувязі з гэтым для абследавання павета былі накіраваны спецыяльныя агенты [1, арк. 23–27]. Дзеля кантроля за падрыхтоўкай да выставы ў паветы і воласці Віцебскай губерні да сярэдзіны красавіка 1923 г. было накіравана 33 студэнты Віцебскага сельскагаспадарчага інстытута.

Да жніўня 1923 г. губернскім выставачным камітэтам было абследавана 38 гаспадарак, уладальнікі якіх маглі б прадставіць годныя экспанаты: 15 – у Віцебскім павеце, 8 – у Аршанскім, 7 – у Веліжскім, па 4 – у Невельскім і Полацкім [5, арк. 83]. Як бачна, абследаванне было здзейснена не асабліва раўнамерна.

У выніку для Усерасійскай сельскагаспадарчай выставы Віцебская губерня прадаставіла 210 экспанатаў для ляснога аддзела, 79 – для аддзела меліярацыі, 72 – для ветэрынарнага аддзела, 30 – для статыстыка-эканамічнага, 8 – для аддзела землеўладкавання, 20 – для аддзела жывёлагадоўлі, 65 – па паляводству, 45 – па агародніцтву, 100 – па садаводству, 58 – па лугаводству, 17 – для аддзела перапрацоўкі прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі, 45 – для агрыкультурнага аддзела, 16 – ад Віцгубсельсаюза, 22 наймення – ад гаспадаркі "Фатынь", 80 найменняў – ад спажывецкай кааперацыі, 74 экспанаты – ад сельскагаспадарчых навучальных устаноў губерні, 23 наймення – для аддзела "Аградапамога", 11 найменняў – для рыбнага аддзела [4, арк. 80–93].

Акрамя таго ад Віцебскай губерні ва Усерасійскай сельскагаспадарчай выставе прыняла ўдзел 31 індывідуальная гаспадарка – яны прадставілі сваіх хатніх жывёл. На такія экспанаты афармляліся спецыяльныя індывідуальныя карткі. Па выніках выставы прэміі атрымалі 9 сялян з Віцебскага павета: 2 – з м. Янавічы, 3 – з в. Буі Лёзненскай воласці, а таксама з с. Міснікі, с. Прыстаўшчыкава Высачанскай воласці, с. Шніці Храпавіцкай воласці, с. Уна Лёзненскай воласці. Імі былі прадстаўлены 2 авечкі, 3 каровы, 2 жарабцы і 2 кабылы. У якасці прызоў сяляне атрымалі ад арганізатараў выставы галёшы, запалкі, соль, тытунь, чайныя прыборы, тканіну, плугі [5, арк. 86, 101–102].

Варта адзначыць, што ўсе сяляне, якія ўдзельнічалі ў выставе, патрацілі на паездку ў Маскву каля 1,5 месяца, бо ім увесь час неабходна было даглядаць за жывёламі, адвезенымі ў якасці экспанатаў (іншымі словамі, яны не маглі займацца сваёй гаспадаркай працяглы час). Губернскі выставачны камітэт выплаціў ім грашовыя кампенсацыі ў памеры 150 рублёў кожнаму, таксама ўсім сялянам сельскагаспадарчы падатак быў зменшаны на 25 %. У дадатак кожную з 9 гаспадарак-пераможцаў па вяртанні з Масквы узнагародзілі 25 пудамі жыта [5, арк. 100].

У цэлым удзел Віцебскай губерні ва Усерасійскай сельскагаспадарчай выставе аказаўся ўдалым. Віцебскі губернскі выставачны камітэт атрымаў ганаровы дыплом другой ступені – “за паўнату асвятлення сельскай гаспадаркі, падрабязную распрацоўку раёнаў і губерні, нагляднасць выявы і арыгінальнасць тэхнікі выканання” [5, арк. 104]. У сваю чаргу найбольш актыўныя службоўцы і сяляне за ўдзел у падрыхтоўцы выставы і прадастаўленне экспанатаў атрымалі пасведчанні [6, арк. 4].

З сярэдзіны 1920-х гг. у БССР выкарыстоўвался практыка правядзення Дзён ураджаю, у рамках якіх арганізоўваліся сельскагаспадарчыя выставы. Тэрмінам правядзення такіх святаў было вызначана 14 кастрычніка (Дзень ураджаю мусіў стаць савецкай заменай праваслаўнаму святу Пакрова Багародзіцы).

У Віцебскай акрузе першы вопыт правядзення Дня ўраджаю меў месца 14 кастрычніка 1924 г., калі ў некаторых населеных пунктах прайшлі аднадзённыя сельскагаспадарчыя выставы [7, арк. 3].

З улікам мінулагодняга вопыту, у 1925 г. было вырашана па магчымасці праводзіць выставы у розныя дні і павялічыць іх працягласць, каб сяляне мелі магчымасць наведаць некалькі мерапрыемстваў. Першапачаткова дзеля эканоміі сродкаў некаторыя раёны планавалі сумесныя выставы. Так, месцам яе правядзення для сялян Лёзненскага раёна было абрана м. Янавічы Суражскага раёна, але паколькі яно было вельмі аддаленым ад патэнцыяльных удзельнікаў, было вырашана арганізаваць асобны Дзень ураджаю ў саўгасе “Адаменкі”, якія размяшчаўся ў цэнтры Лёзненскага раёна. Гарадоцкі і Мяжанскі раёны таксама спачатку планавалі сумесную выставу, але яе правядзенне ў Гарадку было нязручна для жыхароў Мяжанскага раёна, таму ў канцы верасня 1925 г. Мяжанскаму райвыканкаму было дазволена правесці асобную выставу [7, арк. 32, 38–39]. Дзеля масавага апавяшчэння насельніцтва былі выпушчаны спецыяльныя аб’явы.

У выніку ў 1925 г. сельскагаспадарчыя выставы ў Віцебскай акрузе прайшлі вельмі актыўна – яны адбыліся ва ўсіх 12 раёнах (гл. табл. 1). Свае экспанаты прадставілі як асобныя гаспадары, так і ўстановы. У якасці ўзнагарод пераможцы атрымалі плугі, акучнікі, бароны, садовыя інструменты, насенне траў, тканіну, што можна лічыць каштоўнымі падарункамі, бо ў сярэдзіне 1920-х гг. набыць прамысловыя тавары было досыць складана.

У 1926 г., як і ў мінулыя гады, у БССР планавалася арганізацыя “Свята ураджаю”, пачатак якога неабходна было прымеркаваць да 14 кастрычніка. Пры ўмове арганізацыі сельскагаспадарчых выстаў у раёнах мерапрыемствы павінны былі доўжыцца не менш за 2 дні [10, арк. 5].

Табліца 1 – Сельскагаспадарчыя выставы ў Віцебскай акрузе, 1925 г.

| Назва раёна | Месца правядзення | Час правядзення | Колькасць | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | удзельнікаў | экспанатаў | узнагарод |
| Бешанко-віцкі | м. Бешанко-вічы, тэатр “Селянін”, былы маёнтак Стары Мар’янфельд | 14 кастрычніка | 23 | больш за 530 | 58 |
| Віцебскі | г. Віцебск | 25–27 кастрычніка | 196 | 1399 | 124 |
| Высачанскі | с. Высачаны | 14–15 кастрычніка | 199 | 537 | 71 |
| Гарадоцкі | г. Гарадок, гарадскі сад | 14–15 кастрычніка | 154 | 479 | 55 |

Заканчэнне табліцы 1

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Езярышчанскі | м. Рудня, спецыяльна пабудаваныя павільёны | 14 кастрычніка | 196 | 449 | 76 |
| Кузняцоўскі | в. Старае Сяло | 18 кастрычніка | 22 | 113 | 16 |
| Лёзненскі | саўгас “Адаменкі” | 24–25 кастрычніка | 424 | 609 | 131 |
| Мяжанскі | былы маёнтак Мяжа | 14–15 кастрычніка | 205 | 380 | 76 |
| Сенненскі | г. Сянно, двор і сад “Дома селяніна” | 14–15 кастрычніка | 318 | 1793 | 103 |
| Сіроцінскі | м. Шуміліна | 14–15 кастрычніка | 389 | 772 | 82 |
| Суражскі | м. Сураж | 14–15 кастрычніка | 264 | 278 | 74 |
| Чашніцкі | поле ў ваколіцах м. Чашнікі | 14 кастрычніка | 167 | 436 | 57 |

Заўвага. Табліца складзена аўтарам паводле [7, арк. 128–131, 133–134, 139–140, 142–144, 146–147, 154 адв., 155 адв., 156, 161–162, 164, 166, 179].

Нягледзячы на заяву зямельнага аддзела Віцебскага акрвыканкама пра адсутнасць сродкаў, у некаторых раёнах выставы ўсё ж прайшлі. Так, на тэрыторыі Сіроцінскага раёна яна была арганізавана 14–15 кастрычніка ў м. Шуміліна. Сяляне прадставілі 120 экспанатаў, саўгас “Лескавічы” – 48, узнагароды атрымалі 24 чалавекі, на выставе пабывала каля 2500 наведвальнікаў. У г. Сянно 14 кастрычніка ў агранамічным кабінеце была адкрыта сельскагаспадарчая выстава прыкладна на 250 экспанатаў, яе наведала 500 вучняў з раённага цэнтра і 450 сялян, выстава дзейнічала 3 дні. У Мяжанскім раёне абмежаваліся стварэннем у Нардоме кутка з сельскагаспадарчымі экспанатамі, адкрыццё якога адбылося 15 кастрычніка. У Гарадоцкім раёне 17 кастрычніка была праведзена невялікая выстава, у якой удзельнічалі сяляне і некаторыя арцелі, праходзіла яна ў Доме селяніна. Тут было прадстаўлена 52 экспанаты і 11 дыяграм пра развіццё сельскай гаспадаркі ў раёне [10, арк. 13, 24–27, 30–31, 33, 35].

У 1927 г. святкаванне Дня ўраджаю было перанесена з традыцыйнай даты 14 кастрычніка на пачатак лістапада – у сувязі з 10-годдзем Кастрычніцкай рэвалюцыі [12, арк. 18]. Менавіта з гэтай нагоды 7–14 лістапада 1927 г. у г. Віцебску была праведзена II Усебеларуская рэспубліканская выстава малочнай прамысловасці. Яна складалася з шэрагу павільёнаў: акруговых сельскіх саюзаў, яўрэйскіх гаспадарак, Белсельтрэсту, машын і прылад для апрацоўкі малака, кніжнага, малочнай крамы, паказальнага масларобча-сыраварнага завода, навукова-гігіенічнага, паказальнага жывёльнага двара. Агульным лікам тут было 155 экспанатаў (22 – ад Віцебскай аркугі, 25 – ад Бабруйскай, 15 – ад Аршанскай, 28 – ад Мінскай, 6 – ад Мазырскай, 16 – ад Гомельскай, 30 – ад Магілёўскай, 13 – ад Полацкай). Усяго выставу наведала 12465 асоб, у тым ліку для 207 сялян была наладжана цэнтралізаваная экскурсія, сюды ж прыехала 432 навучэнцы (са школ г. Віцебска, з Валагодскага інстытута і Горацкай сельгасакадэміі). Апошні дзень быў адведзены спецыяльна для наведвання выставы чырвонаармейцамі (пабывала 1862 чалавекі) [8, арк. 1–4].

Акрамя таго восенню 1927 г. адбыліся раённыя сельскагаспадарчыя выставы, але ў параўнанні з 1925 г. яны ахапілі меншую колькасць раёнаў (гл. табл. 2).

Табліца 2 – Раённыя сельскагаспадарчыя выставы ў Віцебскай акрузе, 1927 г.

| Назва раёна | Колькасць | | |
|---|---|---|---|
| | экспанатаў | узнагарод | наведвальнікаў |
| Гарадоцкі | 811 | 20 | 6000 |
| Езярышчанскі | 343 | 20 | 1500 |
| Лёзненскі | 358 | 18 | 1000 |
| Мяжанскі | 122 | 20 | 975 |
| Сенненскі | 315 | 25 | 2500 |
| Сіроцінскі | 172 | 17 | 2000 |
| Суражскі | 666 | 46 | 1400 |
| Чашніцкі | 350 | 21 | 800 |

Заўвага. Табліца складзена аўтарам паводле [9, арк. 93–103].

У 1928 г., паводле ўжо існуючай традыцыі, зямельны аддзел Віцебскага акрвыканкама прапаноўваў на Дзень ураджаю праводзіць у раёнах сельскагаспадарчыя выставы. Прэміраванне пераможцаў прадугледжвалася па намінацыях “Паляводства”, “Жывёлагадоўля”, “Конегадоўля”, “Культуртэхніка, гідратэхніка, торфараспрацоўкі” [11, арк. 3–4].

У Гарадоцкім раёне выставу было вырашана правесці не 14 кастрычніка, а на гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі – па прычыне таго, што насельніцтва не было своечасова праінфармавана пра плануемую выставу, таму было прапанавана мала экспанатаў. Сярод прычын чамусьці была названа і малая колькасць калгасаў у раёне, хаця раней у выставах актыўна адзельнічалі і аднаасобныя сяляне. Таксама восенню выставы былі арганізаваны ў Лёзненскім, Мяжанскім і Чашніцкім раёнах [13, арк. 13, 18, 20–21]. Іншымі словамі, актыўнага правядзення выстаў у 1928 г. не адбылося.

З 1929 г. значная увага ў сельскагаспадарчай агітацыі стала надавацца калектывізацыі, а цікавасць да правядзення выстаў пастунова зменшылася. 28 жніўня 1929 г. у Віцебскай акрузе было абвешчана Днём калектывізацыі, які прадугледжваў мітынгі, сходы беднаты і жанчын (у сваю чаргу правядзенне сельскагаспадарчых выстаў не планавалася) [13, арк. 22, 27].

Такім чынам, у 1920-я гг. практыкавалася такая форма абмена вопытам і стымулявання, як сельскагаспадарчыя выставы. Усведамленне станоўчых бакоў падобных мерапрыемстваў прыйшло да сялян і саматужнікаў не адразу, але затым яны пачалі прымаць у іх актыўны ўдзел (асабліва паспяховымі ў гэтым плане былі 1923 г. і 1925 г.). Удзел у выставах даваў сялянам магчымасць не толькі пашырыць свае веды, але і атрымаць матэрыяльнае заахвочванне. Разам з тым, пэўнымі стрымліваючымі фактарамі з’яўляліся патрэба ў значных сродках для арганізацыі падобных мерапрыемстваў і адрыў сялян ад палявых работ на час падрыхтоўкі і правядзення выставы.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 14. – Воп. 1. – Спр. 944.
2. ДАВВ. – Ф. 14. – Воп. 1. – Спр. 1341.
3. ДАВВ. – Ф. 14. – Воп. 1. – Спр. 1376.
4. ДАВВ. – Ф. 14. – Воп. 1. – Спр. 1379.
5. ДАВВ. – Ф. 14. – Воп. 1. – Спр. 1380.
6. ДАВВ. – Ф. 14. – Воп. 1. – Спр. 1532.

7. ДАВВ. – Ф. 71. – Воп. 1. – Спр. 114.
8. ДАВВ. – Ф. 71. – Воп. 1. – Спр. 442.
9. ДАВВ. – Ф. 71. – Воп. 1. – Спр. 444.
10. ДАВВ. – Ф. 71. – Воп. 1. – Спр. 454.
11. ДАВВ. – Ф. 71. – Воп. 1. – Спр. 457.
12. ДАВВ. – Ф. 71. – Воп. 1. – Спр. 807.
13. ДАВВ. – Ф. 71. – Воп. 1. – Спр. 827.

УДК 337.7(476)

# БЕЛОРУССКАЯ ИСТОРИОГРАФИЯ ПРОБЛЕМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПОТРЕБИТЕЛЬСКОЙ КООПЕРАЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В ПЕРИОД НЭПА

Лученкова Е. С., доцент
Витебский государственный технологический университет
г. Витебск, Республика Беларусь

Ключевые слова: историография, потребительская кооперация, новая экономическая политика (НЭП), период исследования, литература, научный труд.

Реферат. В статье предпринята попытка сделать обзор белорусской историографии по проблеме деятельности потребительской кооперации Республики Беларусь в период НЭПа. Дается обзор литературы и научных исследований по определенным временным периодам.

Современные экономические и социальные процессы дают толчок к изучению и анализу опыта периода новой экономической политики. Этот период характеризуется важнейшими изменениями в экономической и политической жизни республики. В этой связи представляется необходимым не только всестороннее изучение, но и критической осмысление опыта прошлого, в том числе, и в развитии потребительской кооперации республики. Анализ её работы свидетельствует о том, что она в условиях переходного периода может превратиться в один из экономических институтов, способных сочетать общегосударственные и частные интересы многих слоев населения.

В связи с этим приобретает особый интерес историографический обзор деятельности потребительской кооперации в период НЭПа.

Первый период исследования относится к 1920–1930 гг. В эти годы, после опубликования известных работ В. И. Ленина «О продналоге» и «О кооперации» вышло значительное количество исследований, анализирующих и пропагандирующих вышеназванные работы, например, работы А. Андреева «Кооперация в социалистическом строительстве» (Москва, 1924 г.), И. Берхин «Основные этапы формирования кооперативного плана В. И. Ленина» (Москва, 1930 г.) и др.

Главная задача литературы состояла в изучении и пропаганде взглядов В. И. Ленина на кооперацию, в разъяснении решений партии и правительства о кооперативном строительстве, в стремлении творчески применять ленинское учение к практическим задачам кооперативного движения.

Вышедшая литература по истории кооперации характеризуется тесной связью с жизнью кооперативного движения. В книгах и брошюрах этого периода большое внимание уделялось выявлению недостатков в кооперативном строительстве и путях к их устранению.